2 **Барабаш, Н. В.** Рэпарацыі з Германіі ў Беларусь у 1945–1948 гг. / Н. В. Барабаш // Известия Национальной академии наук Беларуси. Серия гуманитарных наук. – 2015. – № 4. – С. 38–43.

3 Возрождение БССР после Великой Отечественной войны [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа : https://revolution.allbest.ru/history/00408852_0.html. – Дата доступа : 15.03.2019.

4 Восстановление и развитие экономики Белоруссии в послевоенный период (1945–1950 гг.) Экономика Белоруссии. Исторические очерки XX–XXI века [Электронный ресурс]. – 2015. – Режим доступа : https://kartaslov.ru/книги/Шиптенко_С_А_Павловец_Ю_С_Экономика_Белоруссии_Исторические_очерки_XX_XXI/2. – Дата доступа : 12.03.2019.

5 Концевой, П. А. Особенности использования немецких репараций в восстановлении промышленности и сельского хозяйства БССР (1945 – начало 1950 годов) / П. А. Концевой // Вестник Полоцкого государственного университета. – Серия А. Гуманитарные науки. – 2013. – № 1. – С. 90–94.

6 О первых годах возрождения Гомеля после военных лихолетья и разрухи [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа : https://newsgomel.by/news/society/15793-o-pervyh-godah-vozrozhdeniya-gomelya-posle-voennyh-liholet-ya-i-razruhi.html. – Дата доступа : 05.03.2019.

7 Репарации, выплаченные Германией за убытки во Второй мировой войне. Досье [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа : https://tass.ru/info/1854338. – Дата доступа : 05.03.2019.

8 Репарации по итогам Второй мировой войны. Щедрый жест Сталина [Электронный ресурс]. – 2015. – Режим доступа : https://army-news.ru/2015/06/reparacii-po-itogam-vtoroj-mirovoj-vojny-shhedryj-zhest-stalina/. – Дата доступа : 05.03.2019.

9 Репарации Совесткому Союзу после Великой Отечественной войны [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа : https://w.histrf.ru/ articles/article/show/rieparatsii_sovietskomu_soiuzu. – Дата доступа : 11.03.2019.

10 Станки XIX века и 300-летние династии. Факты из истории Гомельского вагоностроительного завода [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа : https://news.tut.by/society/507116.html. – Дата доступа : 19.03.2019.

УДК 84(100) “1939/45”(476.2)

# ВЫЗВАЛЕННЕ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА І АДНАЎЛЕННЕ ГАСПАДАРКІ (1943–1944 гг.)

*Л. С. СКРАБІНА, А. Д. ВЕРНІКОЎСКІ*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, г. Гомель*

Разгром нямецкіх войскаў летам 1943 г. на Курска-Арлоўскай дузе дазволіў Чырвонай Арміі перайсці ў стратэгічнае наступленне і ужо ў верасні 1943 г. распачаць шырокамаштабную аперацыю вызвалення Беларусі і Украіны. 23 верасня 1943 г. часці Цэнтральнага фронту фарсіравалі Днепр і вызвалілі ад нямецкіх акупантаў першы раенны цэнтр БССР –

гарадскі паселак Камарын. 15 кастрычніка 1943 г. войскі Беларускага фронту разгарнулі наступленне на Лоеўскім напрамку. Удала правялі Гомельска-Рэчыцкую аперацыю, у выніку якой у лістападзе 1943 г. былі вызвалены Рэчыца і Гомель. У канцы лістапада выйшлі да граніц Буда-Кашалёўскага раёна, пачаўшы яго вызваленне.

На досвітку 25 лістапада пачаўся бой за Касцюкоўку. Злучэнні 11-й і 63-й армій павольна прасоўваліся да Буда-Кашалёва. Перад 889-м стралковым палком была пастаўлена задача ачысціць ад праціўніка ўчастак чыгункі ў бок Жлобіна з прылягаючымі населенымі пунктамі. Падыходзячы да в. Марозавічы, 889-ы стралковы полк наткнуўся на міннае поле. На досвітку 27 лістапада супраціўленне фашыстаў у в. Марозавічы было зломлена, пасля чаго завязаліся напружаныя баі за в. Патапаўка. Двое сутак 889, 828 і 862-і стралковыя палкі адбівалі націск ворага. Атрымаўшы падмацаванне ў крытычную хвіліну боя, падраздзяленні дывізіі зноў перайшлі ў наступленне і вызвалілі Патапаўку [1, с. 337–339].

Жорсткая барацьба вялася за в. Губічы. К вечару 28 лістапада 220 стралковы полк 4-й Бежыцкай стралковай дывізіі ўшчыльную падышоў да в. Губічы. З ходу выбіць ворага не ўдалося. Занялі толькі палову вёскі, а на другі бок невялікай рэчкі знаходзіліся немцы. За два дні баёў за в. Губічы полк панёс вялікія страты [2].

Вызваленне Буда-Кашалёва адбылося 28 лістапада. У аператыўнай зводцы Совінформбюро паведамлялася, што на працягу 28 лістапада паміж рэкамі Сож і Днепр паўночна-заходней Гомеля нашы войскі, працягваючы развіваць паспяховае наступленне, авалодалі раённым цэнтрам Гомельскай вобласці горадам Буда-Кашалёва, а таксама занялі больш 150 іншых населенных пунктаў.

5 снежня 1943 г. Буда-Кашалёўскі раён быў поўнасцю вызвалены. У вызваленні Буда-Кашалёўскага раёна вялікую дапамогу савецкім воінам аказалі партызаны. Так, 1-я Буда-Кашалёўская брыгада трымала пераправу праз р. Сож у в. Васільеўка да прыходу Чырвонай Арміі. З 23 верасня па 2 кастрычніка 1943 г. пераправілі некалькі сот буйнай рагатай жывёлы і да 500 чалавек цывільных жыхароў. У кастрычніку 1943 г. брыгада злучылася з Чырвонай Арміяй. Сумесна з часцямі 17-й стралковай дывізіі вяла бой за Струменскую пераправу праз р. Сож. Бой цягнуўся суткі, у выніку была знішчана значная варожая жывая сіла і тэхніка. Адрэзаўшы Струменскую пераправу, 4 кастрычніка 1943 г. ўвесь састаў, які знаходзіўся на левым беразе Сожа, уліўся ў 17-ю стралковую дывізію. А атрад імя Катоўскага і імя Ракасоўскага, рота і два дыверсійных узводы атрада імя Кутузава, две роты атрада імя Чкалава засталіся ў тыле ворага і працягвалі баявую дзейнасць [3, л. 66].

Гады “гаспадарання” нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі прынеслі незлічоныя страты і пакуты нашаму народу. На тэрыторыі

сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна фашысты разрабавалі і знішчылі ўсю прамысловась: лесазавод, Рагіньскі спіртзавод, зруйнавалі чыгуначную станцыю, вадакачку, МТС. Разбурылі і спалілі ўсе школы, установы аховы здароўя. Знішчылі поўнасцю 144 населеныя пункты і часткова 42, разбурылі і спалілі 1336 дамоў калгаснікаў. Самай цажкай стратай было знішчэнне 1038 мірных жыхароў [4].

Пасля вызвалення раёна ад нямецко-фашысцкіх захопнікаў пачаліся аднаўленчыя работы разбуранай акупантамі народнай гаспадаркі.

Аднаўленне эканомікі Беларусі пачалося з восені 1943 г., калі Гомель і частка тэрыторыі вобласці былі вызвалены Чырвонай Арміяй ад нямецка-фашысцкай акупацыі. Па меры далейшага вызвалення пашыраўся і фронт аднаўленчых работ. Вялікую дапамогу ў гэтым аказваў Саюзны ўрад, вылучыўшы значныя грашовыя сродкі, станкі, метал, будаўнічыя матэрыялы, харчаванне, адзенне, абутак, медыкаменты і інш. Шэраг абласцей Савецкага Саюза ўзялі шэфства над вызваленымі раёнамі Беларусі. Ужо ў красавіку 1944 г. прыбылі першыя эшалоны з Удмурціі, Яраслаўскай вобласці з станкамі, маторамі, абсталяваннем, сельскагаспадарчым інвентаром, адзеннем, абуткам і інш.

Аднак асноўны цяжар аднаўлення лег на плечы самога беларускага народа.

Аднаўленне разбуранай і разбараванай народнай гаспадаркі Буда-Кашалёўскага раёна праводзілася пад кіраўніцтвам былых партызан, удзельнікаў падпольных патрыятычных груп, франтавікоў. Раённую партыйную арганізацыю ўзначаліў былы камандзір 1-й Буда-Кашалёўскай брыгады А. М. Дземчанка. У першыя ж пасля вызвалення дні аднавілі сваю работу мясцовыя органы савецкай улады. Раённы Савет узначаліў былы камандзір дыверсійнага ўзводу партызанскага атрада імя М. І. Калініна, 1-й Гомельскай партызанскай брыгады Э. В. Лаўрыновіч.

Адраджэнне сельскай гаспадаркі на вызваленых тэрыторыях пачалося, перш за ўсе, з аднаўлення калгасаў і саўгасаў. Бюро ЦК КП(б)Б, разглядаючы пытанне аб аднаўленні калгасаў у вызваленых ад нямецкіх захопнікаў раёнах Беларусі 7 студзеня 1944 г., вызначыла ў якасці важнай задачы партыйных арганізацый на працягу студзеня-сакавіка 1944 г. аднавіць калгасы ў вызваленых раёнах і вясенні сеў 1944 г. правесці ўжо калгаснымі гаспадаркамі [5, л. 7].

Гэтая задача ў раёне была паспяхова вырашана. Ужо ў красавіку 1944 г. аднавілі сваю работу ўсе 78 калгасаў, 2 МТС (Буда-Кашалёўская і Рагінская), а таксама ўсе калгасы і саўгасы ва Уваравіцкім раёне і Уваравіцкая МТС. Для аднаўлення МТС і калгасаў з вобласці ў Буда-Кашалёўскі раён было завезена 18 трактараў, 1 аўтамашына, 4 жаткі, 4 сенакасілкі, 5 сарціровак [6, л. 27, 43]. Разам з тым, неабходна адзначыць, што сельскагаспадарчай тэхнікі было мала, не хапала коней. За гады вайны

значна скарацілася колькасць жывёлы, таму вялікія цяжкасці ўзніклі ў сувязі з аднаўленнем яго пагалоўя. У калгасах Буда-Кашалёўскага раёна па стану на 25 мая 1944 г. была створана толькі 1 жывёлагадоўчая ферма на 12 галоў буйнай рагатай жывёлы і 1 свінагадоўчая ферма на 15 галоў, а таксама закантрактавана ў калгаснікаў і аднаасобнікаў 800 галоў цёлак [7, л. 5–7]. Аднак ужо ў ліпені 1944 г. ў калгасах раёна было арганізавана 13 ферм буйнай рагатай жывёлы на 119 галоў, 57 свінагадоўчых ферм на 365 галоў, 8 птушкаферм на 295 галоў [8, л. 67].

Вялікая ўвага надавалася вясенняму севу 1944 г. Для паспяховага яго правядзення былі створаны семянныя і страхавыя фонды, адноўлена семянная лабараторыя, ветэрынарная лячэбніца, праведзены ўлік жывёлы. Між тым засыпка семянных і страхавых фондаў ў калгасах праходзіла дрэнна. У канцы студзеня 1944 г. па раёну было засыпана толькі 7,4 % зернавых, 4 % бульбы, 0,76 % тэхнічных культур [8, л. 19]. У такіх умовах немалаважнае значэнне меў пачын калгаснікаў калгасаў "Дружба", "Чырвоны кастрычнік", "Трактарыст" Буда-Кашалёўскага раена, якія ўзялі на сябе абавязацельства засеяць сваімі семянамі калгасныя палі [6, л. 132]. Дзякуючы працоўнаму подзвігу работнікаў сельскай гаспадаркі раёна ў ходзе вясенне-палявых работ 1944 г. было засеяна 9424 га, што складала 70 % ад плана ў т. л., яравых – 6150 га, або 116 % ад плана, ільна – 927 га (77,3 %), бульбы – 2176 га (62 %) [9, л. 8].

Самаадданая праца жыхароў Буда-Кашалёўшчыны была накіравана і на аднаўленне зруйнаванай вайной прамысловасці. Цалкам або часткова былі разбураны Рагіньскі вінакурны, Буда-Кашалёўскі лесапільны заводы, Буда-Кашалёўская бандарна-кузнечная арцель. Вялікая работа была прадзелана па аднаўленню цэхаў Рагінскага вінакурнага завода. Ужо ў чэрвені 1944 г. поўнасцю былі адноўлены брадзільнае аддзяленне, на 80 % – заторнае. Арганізавана торфараспрацоўка па забеспячэнню завода палівам [8, л. 59].

У гэты час пачаў працаваць і Буда-Кашалёўскі лесапільны завод. Аднавіла работу бандарна-кузнечная арцель: у чэрвені 1944 г. ўжо працавалі бандарны цех, кузня, цэх па вытворчасці вобада і калёс. Акрамя гэтага, былі створаны шавецкая і кравецкая арцелі. Была адноўлена і пачала працаваць маслабойня [9, л. 5].

За гады вайны матэрыяльна-тэхнічная база адукацыі, культуры, аховы здароўя была амаль поўнасцю разбурана. Школьныя будынкі ў большасці былі знішчаны, або выкарыстоўваліся акупантамі для сваіх патрэб. Так, да вайны ў Буда-Кашалёўскім раёне мелася 52 школы, засталося толькі 10 [9, л. 6]. Усё школьнае абсталяванне было спалена. Таму задача адраджэння агульнаадукацыйнай школы пасля выгнання акупантаў аказалася вельмі складанай. Трэба было рамантаваць і будаваць занава школы. За перыяд з 15.12.43 г. па 15.02.44. г. аднавілі сваю работу 40 пачатковых, 9 няпоўных сярэдніх школ, у якіх займалася 4871 вучань, працавала 215 настаўнікаў [9, л. 6]. А ў 1944/1945 навучальным годзе яшчэ было адноўлена: 1

сярэдняя, 10 няпоўных сярэдніх, 41 пачатковая школа. На рамонт школ было выдзелена 50 тысяч рублёў [8, л. 76]. Але ў гэтай важнай справе былі цяжкасці. Тыя нямногія памяшканні школ, каторыя ўцалелі, былі заняты воінскімі часцямі. З-за недахопу школьных памяшканняў прыходзілася праводзіць заняткі ў звычайных сялянскіх хатах. Ні адна школа раёна не была поўнасцю забяспечана школьным інвентаром. Не хапала падручнікаў. Зрываліся тэрміны рамонту школ, асабліва дрэнна ішоў выраб і рамонт школьнага абсталявання [9, л. 7].

Хутка адрадзілі сваю дзейнасць установы аховы здароўя. Ужо ў лютым 1944 г. ў раёне было адчынена 8 фельшарска-акушэрскіх пунктаў, 3 урачэбна-амбулаторныя ўчасткі, раённая бальніца, амбулаторыя, зубаўрачэбны кабінет, аптэка, 3 стацыянарныя інфекцыйныя шпіталі, 2 інфекцыйныя ізалятары [8, л. 27]. Аднак не хапала ўрачоў, бялізны для хворых, медыкаментаў, неабходнай колькасці ізалятараў.

Побач з адраджэннем установ культурна-асветнай сферы і аховы здароўя паскоранымі тэмпамі аднаўлялася работа гандлёвых установ. У ліпені 1944 года ўжо былі створаны і працавалі 6 сельпо, 1 сталоўка, 25 гандлёвых кропак. План тавараабароту за І паўгодзе 1944 года выкананы на 160 % [8, л. 67].

Вялікая праца разгарнулася па аднаўленню жылля. Людзей трэба было перасяляць з зямлянак, старых разбураных хат. Усемагчымую дапамогу ў гэтым аказвала дзяржава. Ужо ў лютым 1944 г. было выдзелена 2250 кубаметраў лесу на індывідуальнае будаўніцтва. Грашовыя пазыкі на аднаўленне калгасных гаспадарак і будаўніцтва жылля для сялян перавысілі 238 тысяч рублеў. Была створана брыгада па будаўніцтву дамоў сем’ям франтавікоў. У канцы мая 1944 г. было пабудавана 485 дамоў [9, л. 10, 12].

Такім чынам, у цяжкіх умовах 1943–1944 гг. насельніцтва Буда-Кашалёўскага раёна рабіла ўсе магчымае, каб хутчэй аднавіць прамысловасць, сельскую гаспадарку, стварыць умовы для нармальнай работы культурна-асветных і медыцынскіх установ.

**Спіс літаратуры**

1 **Алтунин, А.** На службе Отечеству / А. Алтунин. – М. : Воениздат, 1985. – 590 с.
2 Авангард. – 1969. – 27 лістапада.
3 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 3500. – Воп. 4. – С. 212. – 1973. – 24 лістапада.
4 Авангард. – 1993. – 16 кастрычніка.
5 НАРБ. – Ф. 4. – Воп. 61. – С. 4.
6 Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай вобласці (ДАГАГВ). – Ф. 144. – Воп. 1. – С. 12.
7 ДАГАГВ. – Ф. 144. – Воп. 1. – С. 15.
8 ДАГАГВ. – Ф. 253. – Воп. 1. – С. 3.
9 ДАГАГВ. – Ф. 253. – Воп. 1. – С. 15.